К. А. Хаджынава

# ПОЛЬСКА-БЕЛАРУСКІЯ КАНТАКТЫ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ РЭТРАСПЕКТЫВЕ

Ролю Польшчы ў фарміраванні дзяржаўнасці і культуры Беларусі нельга недаацэньваць. Стагоддзі ўзаемадзеяння польскага и беларускага народаў адыгралі важнае значэнне ў фарміраванні гісторыі і культуры сучаснай Беларусі. Адной з ключавых фігур, якія паўплывалі на пачатак развіцця ўзаемаадносін паміж краінамі, быў вялікі князь літоўскі Ягайла, які стаў каралём Польшчы ў 1386 г., пасля шлюбу з каралевай Ядвігай. Гэты шлюб прывёў да палітычнага саюза Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы, які аказаў значны ўплыў на гісторыю гэтых краін, а таксама на гісторыю Беларусі [1]. Менавіта жонка Ягайлы, каралева Ядвіга, адрадзіла дзейнасць Кракаўскай акадэміі, у якой ў начатку XVI ст. вучыўся ўсходнеславянскі першадрукар, грамадскі і культурны дзеяч Францыск Скарына.

Важным перыядам адносін Польшчы і Беларусі быў час іх уваходжання ў Рэч Паспалітую, якая была створана ў 1569 г. Гэта дзяржава аб'ядноўвала Польшчу, Літву, Украіну і Беларусь пры агульным манарху. Пашырэнне Рэчы Паспалітай аказала значны ўплыў на развіццё культуры Беларусі, дзякуючы заходнееўрапейскаму уздзеянню і культурнаму абмену [2]. Варта таксама згадаць рэформы і мадэрнізацыю, праведзеныя ў гэты перыяд каралём Стэфанам Баторыем. Аднак у цэлым знаходжанне беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай стала часам заняпаду беларускай культуры і спынення нацыяўтваральных працэсаў з-за неспрыяльных умоў, створаных уладамі краіны. Паланізацыя і акаталічванне беларускага насельніцтва набыло ў гэты час прымусовы характар. Беларусы як этнас апынуліся на мяжы гібелі.

Адной з самых яркіх старонак сумеснага мінулага з'яўляецца перыяд барацьбы за незалежнасць у XIX і XX стагоддзях. У гэты перыяд як польскі, так і беларускі нацыянальныя рухі імкнуліся да самааддачы і вызвалення ад знешняга уплыву [3]. Аднак на сумесныя дзеянні з беларусамі польскія нацыянальныя дзеячы ішлі не ахвотна, робячы стаўку на ўласныя нацыянальныя праекты. У апошніх роля Беларусі зводзілася толькі да каланіяльнай ускраіны адроджанай Польскай дзяржавы. Часткова рэалізаваць гэты план удалося пасля падпісання ў сакавіку 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора, па ўмовах якога Заходня Беларусь была анексавана Польшчай.

Падчас Другой сусветнай вайны і пасля яе адносіны паміж Польшчай і Савецкім Саюзам былі напружанымі, і адбілася на адносінах з Беларуссю.

У наш час Польшча і Беларусь з'яўляюцца суседзямі і спрабуюць падтрымліваюць эканамічныя, палітычныя і культурныя сувязі. Аднак палітычнае кіраўніцтва сучаснай Польшчы не з'яўляецца прыхільнікам канструктыўнага дыялогу.

Такім чынам, Польшча аказала амбівалентны ўплыў на гісторыю і культуру Беларусі.

### *Список литературы*


1. Gliński, M. Польша и Беларусь: похожая судьба, общие мечты / M. Gliński // Culture.pl [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: https://culture.pl/ru/article/polsha-i-belarus-pokhozhaya-sudba-obschie-mechty. - Дата доступу : 19.03.2024.
2. Польская политика «мягкой силы» в отношении Республики Беларусь: концепции и практика // Degruyter.com [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу : https://www.degruyter.com/document/doi/10.1515/cjss-2022-0001/html?lang=en. - Дата доступу : 19.03.2024.
3. Антанович, Н. А. Историко-культурные условия национально-государственного строительства и политическое развитие Республики Беларусь / Н. А. Антанович // Политэкс. - 2010. - Т. 6. - № 2. - С. 176-197 // Cyberleninka.ru [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу https://cyberleninka.ru/article/n/istoriko-kulturnye-usloviya-natsionalno-gosudarstvennogo-stroitelstva-i-politicheskoe-razvitie-respubliki-belarus. - Дата доступу: 19.03.2024.



*Хаджынава Ксенія Аляксандраўна,* студентка 1 курса факультета информационных технологий и управления Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники, xju2005@gmail.com

*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* кандидат исторических наук, доцент, Mikalayeva@bsuir.by.